ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА КУЛЬТУРЫ
«ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СІСТЭМА г. ГРОДНА»
ГРОДЗЕНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА
ІМЯ А. МАКАЁНКА

# ЮЗАФ ЯДКОЎСКІ – ДАСЛЕДЧЫК ГІСТОРЫІ ГАРАДЗЕНШЧЫНЫ

## ДА 130-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

*Бібліяграфічны спіс*



ГРОДНА 2020

**Юзаф Ядкоўскі – даследчык гісторыі Гарадзеншчыны : да 130-годдзя з дня нараджэння : бібліяграфічны спіс / Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна», Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Я. Макаёнка ; складальнік Ю. Ю. Жыткевіч ; пад агульн. рэд. І. М. Ілюшына. – Гродна, 2020. – 14 с.**

Спіс прысвечаны выдатнаму археолагу, нумізмату, гісторыку, архітэктару Юзафу Ядкоўскаму. Заснавальнік і першы дырэктар Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея. Па ініцыятыве Ядкоўскага праведзены археалагічныя даследаванні Старога Замка і пакладзены пачатак яго рэканструкцыі. Асноўнай задачай Юзаф Ядкоўскі лічыў збіранне і захаванне гісторыка-археалагічных матэрыялаў, а таксама пабудовы на іх аснове сталай экспазіцыі музея. Аўтар прац «Гродна», «Гарадзішча Ваўкавыска», «Раннесярэдневяковае Гродна ў святле археалагічных раскопак у Гродзенскім Старым каралеўскім замку ў 1932 і 1933 гадах», «Абарончы храм на Каложы ў Гродне» і інш..

Матэрыялы бібліяграфічнага спіса размешчаны ў лагічным парадку, артыкулы з асобных выданняў і перыядычных выданняў размешчаны ў алфавітным парадку. Бібліяграфічнае апісанне падпарадкоўваецца ДГСТу 7.1–2003 «Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы састаўлення».

Бібліяграфічны паказальнік будзе карысным ўсім тым, хто цікавіцца гісторыяй.



Беларускі і польскі археолаг, нумізмат, гісторык мастацтва, вядомы гродзенскі краязнавец і заснавальнік Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.

Нарадзіўся 20 снежня 1890 года ў Гродне ў небагатай сям'і рамесніка Юзафа Ядкоўскага і Зоф'і Занеўскай. Сям'я жыла ў двухпавярховым доме № 16 на вуліцы Паштовай (цяпер Сацыялістычная).

Выхоўвала Юзафа маці. Пані Соф'я Занеўская шмат зрабіла для таго, каб сын атрымаў сучасныя, для таго часу, выхаванне і адукацыю.

Бацька Ядкоўскі (таксама Юзаф) не мог сыну ўдзяляць шмат часу, бо многа працаваў (сталяр па найму і ў дырэкцыі пошты).

Вучыўся ў Гродзенскай гімназіі, дзе ўдзельнічаў у 1905 годзе ў школьнай забастоўцы. У час вучобы ў гродзенскай гімназіі ён праявіў сябе не толькі як здольны вучань, але і як патрыёт, якога хвалявала адраджэнне свайго краю: быў членам тайных арганізацый, неаднаразова ўдзельнічаў у розных акцыях і вальнадумных выступленнях моладзі. У гэтыя гады ён захапіўся гісторыяй Гродзеншчыны і пачаў збіраць разнастайныя друкаваныя і рукапісныя матэрыялы, а таксама пісаць свае першыя навуковыя працы. У выглядзе невялікіх нарысаў і артыкулаў яны з 1907 года друкаваліся ў выданнях «Віленская газета» («Dziennik Wileński») і «Святавіт» («Światowit»). Апынуўшыся пад пагрозай выключэння з гімназіі, патэнцыяльнага арышту за палітычную дзейнасць і атрымання так званага «воўчага білета», які б зрабіў немагчымым паступленне ў іншую навучальную ўстанову ў Расійскай імперыі, у 1906 ці 1907 годзе Ядкоўскі перабраўся ў Варшаву,

дзе працягваў вучобу і адначасова працаваў у археалагічным музеі.

Скончыў у 1913 годзе Маскоўскі археалагічны інстытут. Працаваў у гэтым жа інстытуце і ў Імператарскім Маскоўскім, і Румянцаўскім музеі. Быў кансерватарам па Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях. Дзякуючы Ядкоўскаму былі захаваны іканастас 17 стагоддзя ў Супраслі, касцёл з фрэскамі ў Гарадзішчы.

Даследаваў касцёлы, замкі і палацы ў Гродна, Лідзе, Крэве, Сынковічах, Супраслі, Міры і іншых населеных пунктах.

У час Першай сусветнай вайны Юзаф Ядкоўскі амаль спыніў даследаванні, бо працаваў у шпіталі і ўдзельнічаў у ваенных дзеяннях. Пасля вайны быў накіраваны на працу ў свой родны горад, які ўвайшоў у склад Польшчы. У 1919 годзе ўрад Польшчы зацвердзіў Ядкоўскага кіраўніком Бюро дзяржаўнай апекі над гістарычнымі і культурнымі помнікамі ў Гродна і Гродзенскім павеце. Вучоны з захапленнем працягнуў даследаванні па гісторыі і культуры роднага краю і падрыхтаваў шмат публікацый. У прыватнасці, яго манаграфія «Гродна», якая выйшла з друку ў 1923 годзе ў Вільні, з’яўляецца значнай навуковай крыніцай па гісторыі горада. У кнізе адлюстравана гістарычнае мінулае Гродна ад старажытнасці да пачатку XX стагоддзя, утрымліваюцца цікавыя звесткі пра яго замкі, касцёлы, цэрквы, змешчаны фотаздымкі і замалёўкі аўтара, а таксама працы вядомых фотамайстраў Я. Булгака і Л. Гельгора.

Усё жыццё Юзаф Ядкоўскі займаўся калекцыяніраваннем прадметаў старажытнасці: кніг, манет, рукапісаў і інш. Запаветнай марай даследчыка была арганізацыя музея ў Гродне. Яна здзейснілася ў 1920 годзе, калі быў створаны Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей. У верасні 1921 года была падрыхтавана першая выстава, на адкрыцці якой прысутнічаў Ю. Пілсудскі. Прадметы і выставачныя стэнды потым былі перанесены ў Стары замак, дзе і па сённяшні дзень знаходзіцца музей. Да 1936 года яго захавальнікам з’яўляўся сам Ядкоўскі. Будучы яго загадчыкам, ён арганізаваў выданне штогодніка

«Музей у Гродне» («Muzeum w Grodnie»), у якім публікаваў таксама і ўласныя навуковыя артыкулы.

У 1925 годзе Юзаф Ядкоўскі прымаў удзел у археалагічных раскопках у Ваўкавыску, па выніках якіх у гэтым жа годзе выдаў кнігу «Grodzisko Walkowyskie». У 1932–1933 гадах Ядкоўскі праводзіў даследаванне Замкавай Гары ў Гродне. Гэтыя раскопкі дазволілі выявіць княжацкі церам і рэшткі двух мураваных храмаў, якія пазней атрымалі назвы «Гродзенская Ніжняя царква» і «Гродзенская Верхняя царква». У 1935 годзе археолаг вывучаў Каложскую царкву і датаваў яе XI стагоддзем. Аднак у 1936 годзе метады вядзення археалагічных раскопак і даследаванняў Юзафа Ядкоўскага былі раскрытыкаваны, прызнаны не адпавядаючымі тагачаснай навуцы і забаронены. 1 ліпеня 1937 года па рашэнні камітэта па адбудове Гродзенскага замка Юзаф Ядкоўскі быў вызвалены з пасады кіраўніка археалагічных раскопак.

З канца 1930-х гадоў Юзаф Ядкоўскі працаваў у Варшаве, з 1944 года – у Кракаве. З 1945 года з'яўляўся захавальнікам Народнага музея, старшынёй Варшаўскага нумізматычнага таварыства, пастаянным аўтарам і рэдактарам часопіса «Wiadomosci numizmatyczno-archeologiczne». Яго намаганнямі быў адноўлены знішчаны падчас Другой сусветнай вайны нумізматычны кабінет музея.

Асноўнай задачай Юзаф Ядкоўскі лічыў збіранне і захаванне гісторыка-археалагічных матэрыялаў, а таксама пабудову на іх аснове сталай экспазіцыі музея. Ён арганізаваў экспедыцыі, набываў рэчы ў віленскіх, варшаўскіх і львоўскіх антыквараў, вёў перапіску з музеямі, якім прапаноўваў дублеты ў абмен на помнікі з мясцовай тэрытарыяльнай прывязкай, разгарнуў выдавецкую дзейнасць.

Творчы пошук і плённая праца Юзафа Ядкоўскага спрыялі вывучэнню і захаванню помнікаў культуры і архітэктуры Гродзеншчыны, прыцягненню ўвагі даследчыкаў да старажытных помнікаў краю. Дзякуючы глыбокім ведам і шырокаму колу навуковых інтарэсаў вучонага фонды музеяў у

Гродна, Беластоку і Варшаве маюць унікальныя калекцыі археалогіі, нумізматыкі, этнаграфіі, твораў народнага мастацтва і дакументаў.

Аўтар прац «Гродна» (Вільня, 1923), «Гарадзішча Ваўкавыска» (Гродна, 1925), «Раннесярэдневяковае Гродна ў святле археалагічных раскопак у Гродзенскім Старым каралеўскім замку ў 1932 і 1933 гг.» (Варшава, 1934), «Абарончы храм на Каложы ў Гродне» (Гродна, 1936) і інш.. Засталася нявыдадзенай шматтомная праца Ядкоўскага «Польскія рэліквіі ў Расіі».

Памёр Юзаф Ядкоўскі 2 студзеня 1950 года ад працяглай хваробы. Пахаваны ў Варшаве на старых могілках «Павонзкі», дзе ў наш час хаваюць толькі знакамітых людзей.

У снежні 1990 года ў Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі адбылася навуковая канферэнцыя з нагоды 100-гадовага юбілею Юзафа Ядкоўскага, яго памяці прысвечаны зборнік артыкулаў «Краязнаўчыя запіскі» (Гродна, 1990).

У 2012 годзе створана Прэмія імя Юзафа Ядкоўскага, якая ўручаецца асобам, творчая дзейнасць якіх паспрыяла вывучэнню і папулярызацыі гарадзенскай мінуўшчыны, а таксама захаванню прыроднай і гісторыка-культурнай самабытнасці Гродна і рэгіёну.

**Ядкоўскі Юзаф** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкалегія : Г. П. Пашкоў і інш. – Мінск : БелЭн, 2004. – Т. 18. – С. 242.

**Иодковский Юзеф** // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : в 5 т. / редколлегия : П. У. Бровка и др. – Мінск : БелЭн, 1982. – Т. 5. – С. 691.

**Ядкоўскі Юзаф** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкалегія : Г. П. Пашкоў і інш. – Мінск : БелЭн, 2003. – Т. 6. – С. 288.

**Ядкоўскі Юзаф** // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя у 2-х т. / галоўны рэдактар Т. У. Бялова. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Пятруся Броўкі, 2011. –Т. 2. – С. 447.

**Ядкоўскі Юзаф** // Археалогія і нумізматыка Беларусі : [энцыклапедыя] / рэдкалегія В. В. Гетаў і інш. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1993. – С. 672.

**Ядкоўскі Юзаф** // Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкалегія : Г. П. Пашкоў і інш. ; мастак З. Э. Герасімовіч. – 2-е выданне – Мінск : БелЭн, 2007. –Т. 2. – С. 777.

**Ядкоўскі Юзаф** // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкалегія Р. М. Аладава, В. І. Анікін, В. І. Атрашкевіч і інш. – Мінск : Беларуская савецкая энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1987. – Т. 5. – С. 678.

**Иодковский Юзеф** (1890–1950) // Регионы Беларуси : энциклопедия в 7 т. / редколлегия В. В. Андриевич. – Минск, 2014. – Т.4. – С. 382–383.

**Ядкоўскі Юзаф** // Беларусь : энцыклапедычны даведнік / Б. І. Сачанка, М. В. Драко, А. Н. Хількевіч – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1995. – С. 787.

**Ядкоўскі Юзаф** // Архітэктура Беларусі : энцыклапедычны даведнік / рэдкалегія : А. А. Воінаў і інш.— Мінск : БелЭн, 1993. – С. 612.

**Ядкоўскі Юзаф** (1890–1950) // Памяць. Гродна : Гісторыка-дакументальная хроніка горада Гродна / рэдкалегія Г. П. Пашкоў. – Мінск, 1999. – С. 321–322.

**Ядкоўскі Юзаф** (1890–1950) // Культура Гродзеншчыны : Факты. Падзеі. Асобы / укладальнік Л. В. Мальцава. – Мінск, 2014. – С. 101.

**Краязнаўчыя запіскі** : зборнік артыкулаў памяці Ю. Ядкоўскага / Упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей і інш. – Гродна, 1990. – 47, [1] с.

**[Юзаф Ядкоўскі] //** Гарадзенскія запісы : старонкі гісторыі і культуры : альманах / Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы, Факультэт беларускай філалогіі і культуры. – Гародня, 1996. – Выпуск 2. – С. 129–139.

**Гальпяровіч, Н. Юзаф Ядкоўскі** // Гродна. На заходняй мяжы Айчыны / Н. Я. Гальпяровіч, Н. Г. Ваніна. – Мінск, 2012. – С. 40.

**Горад як месца памяці [Юзаф Ядкоўскі]** // Гародня X–XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам / Пшэмыслаў Баравік і інш. – Гародня, 2014. – С. 483–497.

**Гостев, А. П. Грабарь Игорь Эммануилович (1871–1960) [и Юзеф Иодковский]** // Известные личности Гродно : Vive La Гродно / А. П. Гостев. – Гродно, 2016. – С. 49–60.

**Гостев, А. П. [Юзеф Иодковский]** // Известные уроженцы Гродненской области / А. П. Гостев. – Гродно, 2016. – С. 84, 115, 285, 286, 315.

**Гостев, А. П. Иодковский Юзеф (1891–1950)** // Известные личности Гродно : Vive La Гродно / А. П. Гостев. – Гродно, 2016. – С. 43–49.

**Дзейнасць Ю. Ядкоўскага па захаванню гістарычнай спадчыны Гродна і ваколіц (па матэрыялах Дзяржаўнага архіва ў Беластоку)** / Вячаслаў Швед // Горад святога Губерта : зборнік краязнаўчых артыкулаў. — Гродна, 2002. – Выпуск 10. – С. 5–11.

**З мінулага ў будучыню : значэнне дзейнасці Юзафа Ядкоўскага – даследчыка горада Гродна ў сучаснай беларускай і польскай навуцы** / Таццяна Казак // Acta Albaruthenica / Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego, 2018. – Т. 18. – С. 413–419.

**Иодковский Юзеф** // Кронон. Летопись города Немана (1116–1990 гг.) / А. П. Гостев, В. В. Швед. – Гродно, 1993. – С. 165–166.

**Казак, Т. Абаронца Гародні Юзаф Ядкоўскі** : хроніка знішчэння / Таццяна Казак // Гісторыя Горадні ХХ–ХХІ ст. – С. 97–102.

**Казак, Т. Гродзенскі музей і лёс яго заснавальніка** / Т. В. Казак // Краязнаўчыя запіскі : зборнік артыкулаў / Упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, Установа культуры «Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей». – Гродна, 2010. – Выпуск 7. – С. 3–45.

**Калекцыя пісанак з фондаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, сабраная Ю. Ядкоўскім** / Бохан А. С. // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : [зборнік артыкулаў] / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы». – Мінск, 2010. – Выпуск 9. – С. 395–404.

**Чарнякевіч, І. Пачаткі этнаграфічных калекцый у Дзяржаўным музеі ў Гродне (1922–1939) [Юзаф Ядкоўскі]** / Ірына Чарнякевіч // Bialorutenistyka Bialostocka / redaktor naczelny H. Twaranowicz ; Uniwersytet w Bialymstoku, Wydzial Filologiczny, Katedra Filologii Bialoruskiej. – Bialystok, 2010. – С. 247–259.

**Швед, В. Дзейнасць Ю. Ядкоўскага па захаванню гістарычнай спадчыны Гродна і ваколіц** : (па матэрыялах Дзяржаўнага архіва ў Беластоку) / Вячаслаў Швед // Горад Святога Губерта : [зборнік краязнаўчых артыкулаў]. – Гродна, 2016. – Выпуск Х. – С. 5–11.

**Шоцік, В. Юзаф Ядкоўскі і яго роля ў стварэнні кнігазбору Гарадзенскага гісторыка-археалагічнага музея** / В. Шоцік // Гістарычны альманах. – Т. 2. – Гародня, 1999. – С. 116–121.

**Ядкоўскі Юзаф //** Архіварыус : зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў / Дэпартамент па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ; [рэдкалегія : Ю. М. Бохан (галоўны рэдактар) і інш.]. – Мінск, 2015. – Выпуск 13. – С. 174–188.

**Ядкоўскі Юзаф. 1863 год у Гродзенскім павеце** // Горад Святога Губерта : [зборнік краязнаўчых артыкулаў]. – Гродна, 2014. – Выпуск VIII. – С. 14–67.

**Казак, Т. Інтэлектуальныя сувязі Вільні і Гродна на прыкладзе дзейнасці Мечыслава Ліманоўскага** / Таццяна Казак // Grodnae et orbi. Гарадскія супольнасці і гарадское асяроддзе XIV—XX стст. : матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гародня, 4–5 лістап. 2017 г.) / [пад рэдакцыяй А. Радзюка, В. Галубовіча]. – Мінск, 2018. – С. 300–307.

**Морза, А.** Роль Ю. **Иодковского в культурной жизни г. Гродно в межвоенный период** : сборник материалов студенческой конференции / А. Морза ; Гродненский государственный медицинский университет // «Язык. Общество. Медицина». – С. 246–249.

**Паўстанне 1863 г. у навуковай спадчыне Юзафа Ядкоўскага** / Тацяна Казак, Андрэй Вашкевіч // Гарадзенскі соцыум, 2013. Гісторыя і памяць. XV–XX стст. : матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гародня, 9–10 лістапада 2013 г.) / [пад рэдакцыяй А. К. Краўцэвіча, А. Ф. Смаленчука]. – Гародня, 2014. – С. 153–157.

**Глазунова, Е.** Диссертация Юзефа Иодковского [(1890, Гродно–1950)] из фондов Государственного исторического

музея / Елена Глазунова // Банкаўскі веснік. – 2018. – № 2. – С. 20–23.

**Госцеў, А.** 125 гадоў з дня нараджэння Язэпа Ядкоўскага / А. Госцеў, В. В. Швед // Наша слова. – 2015. — 23 снежня. – С. 5.

**Журавлева, П.** К юбилею музея повторили выставку 1922 года / Полина Журавлева, Инна Гришук // Вечерний Гродно. – 2010. – 24 ноября – С. 32.

**Какареко, В.** Юзеф Иодковский: музейщик и нумизмат / В. Какареко // Банкаўскі веснік. – 2010. – № 3. – С. 20–27.

**Кніга Юзафа Ядкоўскага «Ваўкавыскае гарадзішча» /** Мікалай Быхаўцаў // Ваўкавышчына : краязнаўчы часопіс. — 2007. – № 3. – С. 59.

**Курачкіна, К.** Вытокі і плынь / Кацярына Курачкіна // Гродзенская праўда. – 2010. – 13 лістапада. – С. 4.

**Куроўская, Т.** Юзаф Ядкоўскі [(1890, г. Гродна–1950)] – «гродзенскі Шліман» / Таццяна Куроўская // Архівы і справаводства. – 2018. – № 2. – С. 102–106.

**Наварыч, Т.** Даследчык старажытнасці : да 120-годдзя з дня нараджэння Юзафа Ядкоўскага / Таццяна Наварыч // Краязнаўчая газета. – 2010. – Снежань (№ 40). – С. 6.

**Навіцкая, Л.** Музей і яго заснавальнік : да 90-годдзя Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея / Лілія Навіцкая // Рэспубліка. – 2010. – 25 лістапада. – С. 6.

**Пірог, У.** Даследчык спадчыны Гродзеншчыны / Уладзімір Пірог // Краязнаўчая газета. – 2015. – № 47. – С. 7.

**Пожарицкий, М.** Люди библиотеки / Михаил Пожарицкий // Беларусь сегодня. – 2008. – 29 мая. – С. 9.

**Швед, В.** Юзаф Ядкоўскі: вядомы і невядомы / В. Швед // Биржа информации (Гродно). – 2000. – 20 января – С. 4.

**Ядкоўскі Юзаф** // Архівы і справаводства. – 2018. – № 2. – С. 102–106.

**20 снежня - 130 гадоў з дня нараджэння Ю. Ядкоўскага (1890, г. Гродна–1950)** / В. Я. Асаёнак [і інш.] // Новыя кнігі. – 2020. – № 10. – Дадат. – С. 14–16.

**Юзаф Ядкоўскі** [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя : свабодная энцыклапедыя. – Рэжым доступу : https://be.wikipedia.org/wiki/Юзаф_Ядкоўскі. – Дата доступу : 11.08.2020.

**Юзеф Иодковский** [Электронный ресурс] // Википедия : свободная энциклопедия. – Режим доступа : https://ru.wikipedia.org/wiki/Иодковский,_Юзеф. – Дата доступа : 11.08.2020.

**Прэмія імя Юзафа Ядкоўскага** [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя : свабодная энцыклапедыя. – Рэжым доступу : https://be.wikipedia.org/wiki/Прэмія_імя_Юзафа_Ядкоўскага. – Дата доступу : 13.08.2020.

**Юзеф Иодковский – страницы жизни** [Электронный ресурс] // Нумизматический портал «Скарбонка». – Режим доступа : http://skarbonka.ru/num-ka/numizmaty/jodk/162-yuzef-iodkovskij-stranitsy-zhizni. – Дата доступа : 12.08.2020.

**Иодковский Юзеф [Электронный ресурс]** // PeopleLife.ru. – Режим доступа : https://www.peoplelife.ru/117755. – Дата доступа : 12.08.2020.

**Юзаф Ядкоўскі** [Электронны рэсурс] // Wikiwand. – Рэжым доступу : https://www.wikiwand.com/be/Юзаф_Ядкоўскі. – Дата доступу : 12.08.2020.

**Юзеф Юзефович Иодковский / Юзаф ЯДКОЎСКІ / Józef Jodkowski** [Электронный ресурс] // Grodno.online.by. – Режим доступа : http://www.grodno.by/grodno/history/biblio/jozef_jodkowski.html. – Дата доступа : 03.12.2020.

**Ядкоўскі Юзаф Юззэфавіч** [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : https://legendy.grodnolib.by/html/Jadkowski_Juzaf.html.php. – Дата доступу : 12.08.2020.

**Иодковский Юзеф** [Электронный ресурс] – Режим доступа : https://google-info.org/6118236/1/iodkovskiy-yuzef.html. – Дата доступа : 04.12.2020.

**Юзаф Ядкоўскі. Падземны Гродна** [Электронны рэсурс] // Harodnia.com. – Рэжым доступу : https://harodnia.com/be/uczora/biblijateka/46-jadkouski-padziemny-hrodna. – Дата доступу : 03.12.2020.

**У Гародні заснавалі прэмію Юзафа Ядкоўскага** [Электронны рэсурс] // Govorim.by. – Рэжым доступу : https://govorim.by/grodnenskaya-oblast/grodno/novosti-grodno/69812-u-garodn-zasnaval-premyu-yuzafa-yadkoskaga.html. – Дата доступу : 12.08.2020.

**Люди библиотеки [есть сведения о Юзефе Иодковском]** [Электронный ресурс] // Sb.by. – Режим доступа : https://www.sb.by/articles/lyudi-biblioteki.html. – Дата доступа : 04.12.2020.

**«Фару Вітаўта» прыдумаў Ядкоўскі. Пяць малавядомых фактаў пра страчаны сімвал Гродна** [Электронны рэсурс] // Hrodna.life. – Рэжым доступу : https://hrodna.life/articles/faru-vitauta/. – Дата доступу : 12.08.2020.

**На каком изображении историк Иодковский Юзеф** [Электронный ресурс] // Цікавы. – Режим доступа : https://cikavy.com/historians/1123. – Дата доступа : 13.08.2020.

**Узнагароду Ядкоўскага ўручаць 8 лістапада. Сярод прэтэдэнтаў Вашкевіч, Гардзееў, Супрон і інш. [ёсць звесткі пра Юзафа Ядкоўскага]** [Электронны рэсурс] // s13.ru. – Рэжым доступу : http://s13.ru/archives/122904. – Дата доступу : 12.08.2020.

Бібліяграфічны спіс

# Юзаф Ядкоўскі – даследчык гісторыі Гарадзеншчыны

ДА 130-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

Складальнік
Жыткевіч Юлія Юльянаўна

Пад агульнай рэдакцыяй
І. М. Ілюшына